-

# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ И АРХЕОЛОГИЯ

# HISTORICAL SCIENCES AND ARCHAEOLOGY

УДК 351.84:93

**Д. А. Крывашэй**
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Акадэмічная, 1, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (17) 284 27 00, norm@tut.by

## АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

Культурная политика как отдельная сфера социального развития общества зародилась в средневековье и прошла в своём развитии семь этапов. На первых этапах заметно сильное влияние церкви на сферу народной культуры. С укреплением абсолютизма и формированием национальных государств растёт государственная опека над образованием и культурой. Культурные учреждения превращаются в популяризаторов национальной идеи и получают государственную поддержку. Развитие капитализма активизирует культурные запросы буржуазии. Формируется общественно-государственная модель культурной политики. История XX века приводит примеры использования культуры в политических целях. В этот период начинает применяться и сам термин «культурная политика». В послевоенный период изменяется стратегия развития культурной политики от «культуры для всех» до мультикультурализма и анимационной концепции. Процессы развития постиндустриального общества с ведущим вниманием на сферу услуг и потребления поставили перед культурной политикой задачу продвижения культурных индустрий, стимулирования частных инвестиций и дальнейшей децентрализации управления.

**Ключевые слова:** культурная политика; управление культурой; национальное государство; государственная поддержка культуры.
Библиогр.: 15 назв.

**D. A. Kryvoshei**
State Scientific Institution “Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus”, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 1, Akademichnaja str., 220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (17) 284 27 00, norm@tut.by

## THE MAIN STAGES OF FORMATION AND DEVELOPMENT OF CULTURAL POLICY

The cultural policy as a separate sphere of social development originated in the Middle Ages and went through seven stages. In the early stages the Church heavily influenced on the sphere of popular culture. State care about education and culture increased with the consolidation of absolutism and formation of national states. Cultural institutions were transformed into promoters of national ideas and received state support. The development of capitalism intensified cultural needs of bourgeoisie. The public-state model of cultural policy formed.

The history of the twentieth century also provided examples of the use of culture for political purposes. During that period the term “cultural policy” came into use. In the postwar period the strategy for the development of cultural policy changed from “culture for all” to the concepts of multiculturalism and animation. The development processes of post-industrial society with the major attention to the scope of services and consumption assigne the following tasks to cultural policy: promotion of cultural industries, encouragement of private investments and further decentralization of management.

**Key words:** cultural policy; cultural management; national state; the state support of culture.
Ref.: 15 titles.

**Уводзіны.** Культурная палітыка разглядае культуру выключна ў сацыялагічным (функцыянальным) вызначэнні як рэгулятар чалавечых паводзін. Сярод сродкаў, пры дапамозе якіх рэалізуецца культурная палітыка, выдзяляюцца сацыяльныя інстытуты рэлігіі, мастацтва і навукі. Менавіта яны разам

© Крывашэй Д. А., 2016

з каналамі распаўсюджання (адукацыяй і масавымі камунікацыямі) ствараюць магутны комплекс, які фарміруе карціну свету ў масавай свядомасці [1, с. 70].

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца выяўленне асноўных этапаў станаўлення і развіцця культурнай палітыкі як адной са сфер публічнай палітыкі. На сёння не існуе абагульняючых прац па дадзенай праблеме. Асобныя аспекты праблемы разглядаліся ў рамках даследаванняў гісторыі адукацыі, друку, цэнзуры, культуры.

**Метадалогія і метады даследавання.** Для вырашэння пастаўленых задач мы выкарыстоўвалі сістэмны, тыпалагічны і параўнаўчы метады. Асноўнымі прынцыпамі былі абраны прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці. Для эфектыўнага вывучэння культурнай палітыкі ў яе гістарычным развіцці намі выкарыстоўваўся міждысцыплінарны падыход: улічваліся змены ў сацыяльным і культурным жыцці грамадства, развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, адукацыі і культуры. Аналізам былі ахоплены змены ў поглядах на месца і ролю дзяржавы ў кіраванні свецкім грамадствам, аспекты станаўлення і развіцця нацыяналізму як асновы пабудовы свецкай дзяржавы ў Еўропе.

На падставе гэтага намі выдзелены некалькі этапаў у гісторыі культурнай палітыкі.

**Асноўная частка.** ***Культурная палітыка ў сярэднявечча.*** Галоўным суб'ектам ў здзяйсненні культурнай палітыкі выступала царква, якая выкарыстоўвала мастацтва для фарміравання карціны свету і атрымлівала з рук дзяржавы права кантролю за развіццём мастацтва ўвогуле. Нельга, аднак, гаварыць аб татальным панаванні царквы над культурным жыццём народа. Магутнымі былі традыцыі язычніцтва. Гэта тлумачыцца адсутнасцю трывалых інфармацыйна-камунікацыйных сувязей у дзяржаўных утварэннях часоў ранняга сярэднявечча ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі.

У высокім сярэднявеччы з узнікненнем гарадоў узрасла роля такіх суб'ектаў культурнай палітыкі, як гарадскія абшчыны. Назіраецца рэзкі ўздым развіцця тэхналогій, рост тавараабароту і пашырэнне камунікацыйнай прасторы. Расце практычная запатрабаванасць у адукацыі, што прыводзіць да росту колькасці і разнастайнасці адукацыйных устаноў. Развіццё таварна-грашовых адносін, рост гарадоў, распаўсюджанне асветы і звязанага з ёй вальнадумства суправаджалася ростам ерасяў, для барацьбы з якімі каталіцкая царква стварае інквізіцыю.

З XIV стагоддзя ўжо не царква а гарадскія рады разам з цэхамі рамеснікаў выступаюць арганізатарамі культурных акцый. Найбольш дасведчаныя іх ўдзельнікі аб'ядноўваюцца ў асаблівыя «брацтвы», якія становяцца першымі прафесійнымі аб'яднаннямі творцаў.

Адной са складовых частак культурнай палітыкі гэтага перыяду была рэлігійная цэнзура над распаўсюджаннем і тлумачэннем Святога Пісання. Ва ўмовах рукапіснага стварэння новых кніг цэнзура не мела вялікага значэння.

***Культурная палітыка канца XV — першай паловы XVII стагоддзя.*** У ранні Новы час, ці эпоху Адраджэння, адбываецца радыкальная ломка традыцыйнай народнай культуры, ствараецца новая культура. Ва ўмовах жорсткай рэлігійнай барацьбы былі забаронены чарадзейныя п'есы і містэрыі, народныя казанні, святочныя рэлігійныя фэсты і паломніцтвы. Распачаліся ганенні на актораў і менестрэляў. Пад забарону патрапілі кірмашы, карнавалы, народныя танцы, лялечныя спектаклі і народная рэлігійная драма. Знішчаліся абразы і скульптуры, спальваліся кнігі, высякаліся «майскія дрэвы» [2, с. 240]. У Рэчы Паспалітай адбываецца радыкальная рэформа веравызнання — ствараецца ўніяцкая царква.

Развіццё гуманістычных ідэй прыводзіць да ломкі ідэалагічных поглядаў на дзяржаву. Адбываецца важная змена ў асяроддзі суб'ектаў культурнай палітыкі. Пасля хвалі рэфармацыйных рухаў XVI стагоддзя ў шэрагу краін Заходняй Еўропы каралі пачалі прызначаць вышэйшых духоўных асобаў пратэстанцкіх цэркваў. А ў некаторых нямецкіх пратэстанцкіх княствах самі курфюрсты прымалі на сябе абавязкі епіскапаў. Як у пратэстанцкіх, так і ў каталіцкіх краінах адбывалася наступленне на правы духавенства [3, с. 131].

Лакальнасць традыцыйных жыццёвых светаў і «сегментарнасць» грамадскасці дазволіў пераадолець новы сродак камунікацыі эпохі Адраджэння — друкаваная кніга. Паступова публічная сфера развівалася ў напрамку палітычна ангажаванай грамадзянскай супольнасці [4, с. 121]. Дзякуючы кнігадрукаванню, рэфарматары здолелі данесці да грамадства свае ідэі.

З фарміраваннем абсалютысцкіх дзяржаў пачала распаўсюджвацца ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці. Яе ідэолагам выступала маладая буржуазія. На аснове гуманістычнага светапогляду фарміруецца культурнае свецкае асяроддзе. У асобе гуманістаў мы бачым свецкую інтэлігенцыю. Аднак яна яшчэ нешматлікая, а яе погляды незразумелыя грамадству, у якім пануе рэлігійны светапогляд.

Пасля рэлігійных смут XVI стагоддзя абсалютызм з апораю на царкву пранікае ва ўсе часткі сацыяльнага арганізма. Улады пераследуюць народныя традыцыі, ствараецца новая культура, якая грунтуецца на ідэях гуманізму і аказвае магутнае ўздзеянне на фарміраванне светапогляду асобы. Генрых IV Бурбон (1589—1610) пасля доўгіх рэлігійных войнаў сфармуляваў далёка ідучыя планы палітычнага, гаспадарчага і культурнага аднаўлення Францыі. У час праўлення Людовіка XIII з'яўляюцца першыя культурныя інстытуты, у задачы якіх уваходзіць ахова культурнай артадоксіі. Такую ролю выконвалі створаныя Французская акадэмія (1635) і Акадэмія жывапісу і скульптуры (« l'Académie de peinture et de sculpture », 1642).

Рэфармацыя натхніла свецкую ўладу на тое, каб у поўнай меры выкарыстаць дадзеныя ёй паўнамоцтвы ва ўсіх сферах грамадскага і прыватнага жыцця [5, с. 50]. Ствараецца свецкая цэнзура. Шэраг абмежаванняў і правіл культурнага жыцця ўтрымліваюцца ў разнастайных пастановах гарадскіх уладаў і гільдый (брацтваў). Гэта абгрунтоўвалася прадухіленнем амаральнасці і палітычнай непакоры, абаронаю царквы [6, с. 72].

***Культурная палітыка другой паловы XVII — 80-х гадоў XVIII стагоддзя.*** З умацаваннем абсалютызму пытанням культуры надаецца ўсё больш увагі. У асобных краінах назіраецца стварэнне такіх культурна-мастацкіх інстытутаў, як каралеўскія музычныя і драматычныя тэатры. Адбываецца фарміраванне дзяржаўнай сістэмы кіравання імі, ліквідуюцца інстытуты тэатральнага самакіравання, пачынае ажыццяўляцца кантроль за рэпертуарнай палітыкай. Нормай жыцця дзяржаўнай мастацкай установы становіцца атрад кіраўнікоў-чыноўнікаў (упраўляючыя, адміністратары, дырэктары). Такім чынам нарадзілася новая форма адносін, якая існуе да цяперашняга часу.

Расце колькасць краін, у якіх акрамя каралеўскіх тэатраў засноўваюцца акадэміі мастацтваў. Іх стварэнне мела на мэце не толькі садзейнічанне прапагандзе афіцыйнага мастацтва, афіцыйна зацверджаных ідэалаў і мастацкіх каштоўнасцей. Каралеўскія акадэміі і тэатры падымалі аўтарытэт мастацкай працы і садзейнічалі яе прафесіяналізацыі. Пры каралеўскіх тэатрах ствараліся школы [7, с. 77, 78].

Многія каралеўскія тэатры, бібліятэкі, зборы старажытнасцей становяцца часткова ці поўнасцю адкрытымі для публікі. Закладваюцца асновы муніцыпальнай і дзяржаўнай падтрымкі культурных мерапрыемстваў.

У XVIII стагоддзі мастацкія ўстановы былі ўключаны ў сферу дзяржаўнай падтрымкі. Гэта абгрунтоўваецца як пашырэннем асветы сярод насельніцтва, так і эканамічнымі выгодамі.

Адначасова, незалежна ад дзяржавы, дзякуючы трэцяму саслоўю, пашыраюцца ідэі свабоды, роўнасці і братэрства. Гэта ставіць пад пагрозу само існаванне манархій. Дзяржаўная культурная палітыка ў многіх краінах набывае ахоўны характар. Яскравым таму сведчаннем служыць цэнзура, пераслед асобных прадстаўнікоў культуры, спыненне дзейнасці ўстаноў культуры, друкарняў. У асобных пратэстанцкіх краінах цэнзура была адменена. Побач з цэнзурай кніг і перыядычных выданняў распаўсюджваецца цэнзура тэатральных пастановак.

Працягваецца ўніфікацыя моваў. Народная адукацыя ў асобных краінах (Швецыя, Прусія, Аўстрыя) была пастаўлена пад нагляд дзяржавы. У 1773 годзе ў Рэчы Паспалітай была створана Адукацыйная камісія — фактычна першае міністэрства асветы ў Еўропе.

У гэты перыяд з'яўляецца новы аб'ект культурнай палітыкі — аўтарскае права. Твор мастацтва стаў разглядацца як уласнасць, якая можа быць прададзена ці здадзена ў наём. Акрамя гэтага, з пункту гледжання дзяржаўнага нагляду спрашчаўся кантроль за прыналежнасцю твора канкрэтнай асобе, выкананнем канкрэтнага твора, атрыманнем аўтарскага ўзнагароджання, за распаўсюджаннем і продажам.

***Культурная палітыка буржуазнага грамадства і каланіялізму (90-я гады XVIII — пачатак XX стагоддзя).*** Гэта перыяд выспявання еўрапейскіх нацый як новых сацыяльна-гістарычных супольнасцей і фарміравання нацыянальных дзяржаў. Сацыяльныя адносіны трансфармуюцца ў капіталістычныя. Назіраецца актывізацыя інтэлектуальнага жыцця. Фарміруецца канцэпцыя сацыяльнай дзяржавы, у якой заўважна сукупнасць урадавых практык умяшання ў сферу культуры. Асаблівая

ўвага надаецца захаванню культурнай спадчыны, практычнаму набліжэнню народа да культуры. У мэтах кансалідацыі нацыі засноўваюцца нацыянальныя ўстановы культуры (музеі, галерэі, бібліятэкі), уводзіцца паняцце гістарычнага помніка і распрацоўваюцца прынцыпы яго аховы.

У кантэксце рэалізацыі праектаў нацыянальных дзяржаў ставіцца задача гамагенезацыі культуры, стварэння аднароднага сацыяльнага і культурнага ландшафту. Улады вядуць барацьбу з дыялектамі і культурнай разнастайнасцю. Насаджаюцца ўніверсальныя нормы мовы, выпрацоўваюцца каноны нацыянальнай культуры [8].

Усеагульная адукацыя становіцца клопатам дзяржавы. Школы паступова выводзяцца з-пад уплыву царквы. Поруч з еўрапейскімі краінамі адукацыйныя рэформы, накіраваныя на стварэнне свецкіх школ, увядзенне ўсеагульнай пачатковай адукацыі, былі праведзены ў Асманскай імперыі ў перыяд Танзімата. Абавязковая пачатковая адукацыя была ўведзена ў Японіі ў ходзе рэформ Мэйдзі.

Нямецкая канцэпцыя Kulturstaat (дзяржавы, якая здзяйсняе культурныя мэты) у дзяржаўным кіраванні адзначала для культурнай палітыкі карэкціроўку адміністрацыйнага і фінансавага забеспячэння. Публічная падтрымка культурных устаноў стала з гэтага часу «нацыянальнай задачай», на рэалізацыю якой усё часцей накіроўваюцца сродкі з дзяржаўнага і муніцыпальнага бюджэтаў [6, с. 73].

Да канца XIX стагоддзя, дзякуючы грамадскай ініцыятыве, складваецца грамадска-дзяржаўная мадэль культурнай палітыкі. Разнастайныя грамадскія аб'яднанні, мецэнацтва сталі паўнапраўнымі суб'ектамі культурнай палітыкі. Найбольш яскрава ўдзел грамадства ў культурнай палітыцы бачны ў ЗША, дзе асноўныя ініцыятывы ў сферы культуры былі прадастаўлены прыватным асобам.

Задача стварэння адзінай нацыі становіцца вядучай у культурнай палітыцы ЗША. На мяжы XIX—XX стагоддзяў узнікае ідэя «плавільнага катла» («плавільнага тыгля»). Яна стала стрыжнем культурнай палітыкі ЗША [9, с. 204—205].

***Культурная палітыка ў «эпоху катастрофаў» (1914 — пачатак 1950-х гадоў).*** У новых дзяржавах, створаных пасля Першай сусветнай вайны, актыўна распрацоўвалася моўная палітыка, нацыянальны курс дзяржавы, канцэпцыя нацыянальных і публічных музеяў і бібліятэк, новыя сімвалы, знакі і помнікі. Ішла праца па стварэнні матэрыяльнай базы новых тыпаў ідэнтычнасці, ладу жыцця, спосабаў індывідуальных і грамадскіх паводзін. Культурная палітыка многіх краін мела цэнтралізаваны характар, пры якім вядучая роля адводзілася дзяржаве. Цэнтралізаваная культурная палітыка была накіравана на пашырэнне сеткі ўстаноў культуры. Яны ствараліся і накіроўваліся цэнтральнай уладай. У аснову гэтай палітыкі было пастаўлена культурнае спажыванне.

У гэты час з'явіліся першыя азначэнні тэрміна «культурная палітыка». Так, у 1929 годзе ў «Дзяржаўным лексіконе» Гердэра даецца тлумачэнне паняцця «культурная палітыка» як «выкарыстанне інтэлектуальных і культурных рэсурсаў дзяржаваю» (“Einsatz geistiger Mittel und kultureller Mittel durch den Staat”) [10, с. 693]. У гады нацысцкай дыктатуры ў Германіі гэты тэрмін шырока выкарыстоўваўся.

Таталітарныя дзяржавы (СССР, Германія, Італія) разглядалі культуру як інструмент укаранення ў свядомасць людзей партыйна-дзяржаўных каштоўнасцей. У культуры панаваў класавы падыход. Дзяржава актыўна ўмешвалася ў культурна-творчы працэс. Культура выкарыстоўвалася ў якасці зброі ідэалагічнай барацьбы. Актыўна дзейнічала цэнзура мастацкіх твораў, радыё, кіно, друку.

У ЗША законам 1917 года была замацавана перавага прыватнага сектара ў сферы культуры. Аднак у 1930-я гады адбыўся адыход ад вызначаных прынцыпаў. Гэта было звязана з рэалізацыяй федэральных культурных праграм «новага курса» прэзідэнта Франкліна Рузвельта. Праведзеныя ў часы «вялікай дэпрэсіі», яны дазволілі захаваць культурны сектар эканомікі. Папулярнай стала ідэя аб тым, што дэмакратычны ўрад павінен праследаваць мэты, якія адрозніваюцца ад мэтаў прыватных прадпрыемстваў. Толькі так можна апраўдаць дзяржаўныя субсідыі, накіраваныя ў сферу культуры.

Працягваюцца мадэрнізацыйныя працэсы ў краінах Азіі. У Турцыі з 1924 года праводзіцца радыкальная палітыка лаіцызму. Ствараецца свецкая дзяржава з апорай на турэцкую мову на аснове новага алфавіту. Культурная палітыка была накіравана на кансалідацыю нацыі, умацаванне нацыянальнай тоеснасці, стварэнне монаэтнічнай дзяржавы. Істотная ўвага надавалася рэалізацыі прынцыпу народнасці. Музеі краіны становяцца часткай нацыянальнай палітыкі. Яны вырашалі задачу прапаганды і згуртавання нацыі [11].

***Станаўленне культурнай палітыкі як асобнай навуковай дысцыпліны і суб'екта публічнай палітыкі (1950-я — 1980-я гады).*** У 1950-я гады культура разумелася як універсальная каштоўнасць,

даступнасць да якой дзяржава «ўсеагульнага дабрабыту» павінна забяспечыць усім грамадзянам. Культурныя шанцы павінны быць аднолькавымі ў цэнтры і на перыферыі. Сфера культурнай палітыкі была супрацьпастаўлена сферы культурных індустрый і культуры забаў. Ставілася задача далучыць да «высокай» культуры кожнага. З гэтай мэтай разгортваецца будаўніцтва культурных устаноў у рэгіёнах [9].

Дзякуючы эканамічнаму росту культурная палітыка была адной з прыярытэтных галін шмат у якіх краінах Еўропы. Сведчаннем гэтага з'яўляецца стварэнне асобных міністэрстваў культуры. У 1953 годзе яно было створана ў СССР. Па дадзеных ЮНЕСКА, да канца 1980-х гадоў больш чым у 117 краінах свету меліся адпаведныя міністэрствы і органы, што кіравалі культурай.

Інстытуцыяналізацыя культурнай палітыкі дае штуршок фарміраванню асобнага напрамку навуковых даследаванняў, якое спалучыла ў сабе пытанні культуралогіі, дзяржаўнага кіравання, эканомікі, сацыялогіі. Вялікую папулярнасць набыў параўнаўчы метад даследавання культурнай палітыкі, назіралася павышэнне зацікаўленасці як культурнымі, так і даследаваннямі публічнай адміністрацыі, эканомікі культуры і, асабліва, эканамічных і прававых ўмоў вытворчасці і дыстрыбуцыі культурных паслуг. Гэта час першых міждысцыплінарных і міжнародных даследаванняў, эпоха станаўлення і развіцця навуковых сетак ў галіне сацыяльных навук. У 1960-х гадах паняцце «культурная палітыка» было ўведзена ў шырокі навукова-практычны абарот на круглым стале ЮНЕСКА ў Манака (1967) [12, с. 5].

У выніку росту зацікаўленасці праблемай параўнаўчых даследаванняў культурнай палітыкі ў рамках ЮНЕСКА ў 1970 годзе адбылася першая канферэнцыя міністраў культуры. У тым жа годзе ў Венецыі пад эгідай ЮНЕСКА сабралася першая сусветная канферэнцыя міністраў культуры. На ёй былі вызначаны чатыры пастулаты, накіраваныя на арганізацыю культурна-асветнага жыцця: дзяржаўная адказнасць за справы культуры; наданне культуры аднолькавых правоў з адукацыяй і навукай; прымяненне планаў і прагнозаў развіцця культурнай палітыкі; сувязі прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі з навукова-даследчымі асяродкамі [13]. Рэгіянальныя канферэнцыі міністраў культуры скліккаліся потым дастаткова рэгулярна. Як і чакалася, яны садзейнічалі нараджэнню і распаўсюджанню ідэй і новых практык.

Інтарэс да гэтай тэмы ў далейшым прывёў да распрацоўкі ЮНЕСКА і Еўрапейскай камісіяй розных буйнамаштабных праграм, абсерваторый і навуковых сетак з мэтаю маніторынгу і апісання стану культурнай палітыкі ў краінах-членах. У рамках ЮНЕСКА пачынаюць рэгулярна рыхтавацца публікацыі з серыі «Даследаванні і дакументы культурнай палітыкі».

У 1970-я гады стратэгія культурнай палітыкі была перагледжана. На змену лозунгу «культура для ўсіх» прыйшоў лозунг «культура для кожнага». Гэта гарантавала права на творчасць і самавыражэнне, павагу да культурнай разнастайнасці. Была ўзмоцнена дэцэнтралізацыя кіравання сферай. Дзяржава абавязвалася падтрымліваць як прафесійную, так і аматарскую дзейнасць. У выніку з'явіліся мультыкультуралізм і анімацыйная канцэпцыя, якія патрабавалі актыўнага ўключэння грамадзян у культурнае жыццё. Размывалася аўтаномія прафесіяналаў і мяжа паміж высокай і народнай культурамі.

З сярэдзіны 1950-х гадоў назіраецца тэндэнцыя ўзаемасувязі дзяржаўных і прыватных устаноў культуры ў ЗША. Адбываецца ўсё большае ўмяшанне дзяржавы ў рэгуляцыю культурнага жыцця. Пасля працяглых дэбатаў у Кангрэсе і шырокай дыскусіі ў краіне ў 1965 годзе быў заснаваны Нацыянальны фонд мастацтваў і гуманітарных навук. У 1980-я гады пры адміністрацыі Р. Рэйгана прыярытэтнай мадэллю дзяржаўнай палітыкі ЗША стаў «новы федэралізм», які прывёў да значнага ўзмацнення і без таго моцных пазіцый прыватных дабрачынных фондаў, спонсарскіх арганізацый і іншых недзяржаўных інстытутаў [14, с. 85].

У 1980-я гады мэты культурнай палітыкі атрымалі новы напрамак. Культурныя мерапрыемствы сталі разглядацца як інструменты дасягнення сацыяльных мэтаў. Ва ўмовах эканамічнага крызісу культура і мастацтва павінны былі вырашаць праблемы беспрацоўя, рэінтэграцыі маладых людзей і інш.

У гэты час з'яўляюцца навуковыя распрацоўкі тыпаў і мадэляў культурнай палітыкі. Былі зроблены спробы вызначэння і апісання сувязей паміж нацыянальнай культурнай палітыкай і культурным, інтэлектуальным і гістарычным кантэкстамі тых краін, у якіх яны развіваліся. «Мазгавым цэнтрам» вызначэння мадэляў развіцця культурнай палітыкі ў Еўропе становіцца дацкая асацыяцыя CIRCLE (Cultural Informational and Research Centers Liaison in Europe), створаная ў 1984 годзе. У 1986 годзе Савет Еўропы пачаў рэалізоўваць праграму падрыхтоўкі і аналізу аглядаў культурнай палітыкі розных краін.

***Культурная палітыка ў эпоху інфармацыйнага грамадства (1990-я гады — цяперашні час).*** У гэты перыяд працягваецца дэцэнтралізацыя культурнай палітыкі і афармляецца інструментальны падыход да яе. Прынцыповая каштоўнасць культуры стала вызначацца яе здольнасцю служыць разнастайным палітычным мэтам і стратэгіям, накіраваным на грамадскае развіццё ці рашэнне сацыяльных праблем.

Дэцэнтралізацыя адкрыла дарогу такім актарам культурнай палітыкі, як прыватны капітал, грамадскія арганізацыі, дзяржаўныя адміністратары з галін, не звязаных з культурай. Пашыраецца практыка дзяржаўна-прыватнага партнёрства і міжгаліновых культурных праектаў. На змену прадстаўленню аб тым, што культурная палітыка з'яўляецца кампетэнцыяй тых, хто прымае рашэнні на нацыянальным узроўні, прадстаўнікоў публічнай адміністрацыі, прыходзіць канцэпцыя «крэатыўнага кіравання».

Адначасова ў сферу культурнай палітыкі ўключаюцца культурныя індустрыі. У 1990-я гады ў Аўстраліі ў якасці асноўнай ідэі вызначаецца ідэя «крэатыўнай нацыі». Яна мела дзве задачы: працаваць у напрамку поўнага прызнання мультыкультуралізму і прасоўваць творчыя індустрыі. У Еўропе гэтая ідэя пачала рэалізоўвацца ў Вялікабрытаніі з 1997 года.

Істотныя змены канцэпцыі культурнай палітыкі адбыліся пасля сусветнага крызісу 2009—2011 гадоў. Большасць краін, якія рэалізавалі мадэль дзяржавы «ўсеагульнага дабрабыту», зменшылі дзяржаўнае фінансаванне сферы культуры. Пры гэтым першачарговае значэнне стала надавацца актывізацыі дзейнасці ўстаноў па паляпшэнні сваіх даходаў і стымуляванні прыватных інвестыцый з мэтай фінансавання культурнага жыцця.

Поруч з відавочным ў пачатку другога дзесяцігоддзя XXI стагоддзя змяншэннем дзяржаўнай падтрымкі сферы культуры ў краінах Еўропы назіраецца істотнае павелічэнне публічных выдаткаў у гэтую сферу ў Кітаі. У краіне рэалізуецца новая канцэпцыя выкарыстання культуры ў якасці асноўнага складніка росту сукупнай моцы дзяржавы. Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Кітая ў 2011 годзе абвясціў аб новай стратэгіі развіцця краіны — пабудове «магутнай культурнай дзяржавы» («вэньхуа цяньго»). Была пастаўлена задача садзейнічаць дасягненню «рыўка» ў развіцці культурнай індустрыі і фарміраванні культурна-індустрыяльнай сістэмы [15].

**Заключэнне.** Культурная палітыка як асобная сфера сацыяльнага развіцця грамадства зарадзілася ў сярэднявеччы і прайшла ў сваім развіцці сем этапаў. Асноўнымі яе суб'ектамі былі дзяржаўныя структуры, царква, органы грамадскага самакіравання і прадпрымальнікі. Адбываліся змены ў непасрэдным аб'екце культурнай палітыкі. На розных этапах развіцця змяняліся як вядучыя суб'екты, так і сферы культуры, якія падпадалі пад іх уздзеянне.

На першых этапах заўважны моцны ўплыў царквы на сферу народнай культуры. З умацаваннем абсалютызму і фарміраваннем нацыянальных дзяржаў расце дзяржаўная апека над адукацыяй і культурай. Культурныя ўстановы ператвараюцца ў папулярызатараў нацыянальнай ідэі, атрымліваюць дзяржаўную падтрымку.

Развіццё капіталізму актывізуе культурныя запыты буржуазіі. Фарміруецца грамадска-дзяржаўная мадэль культурнай палітыкі. Рост рабочага руху прымушае звярнуць ўвагу на сацыяльную сферу. Выпрацоўваецца мадэль сацыяльнай дзяржавы, у якой важнае месца надаецца культуры.

Гісторыя XX стагоддзя падае прыклады выкарыстання культуры ў палітычных мэтах. У гэты перыяд пачынае выкарыстоўвацца і сам тэрмін «культурная палітыка». Відавочнай становіцца неабходнасць дзяржаўнай апекі над сферай культуры. Назіраецца істотны рост колькасці краін, у якіх дзейнічаюць асобныя міністэрствы культуры. У пасляваенны перыяд адбываецца паступовая змена стратэгіі развіцця культурнай палітыкі ад «культуры для ўсіх» да мультыкультуралізму і анімацыйнай канцэпцыі.

Працэсы развіцця постіндустрыяльнага грамадства з вядучай увагай на сферу паслуг і спажывання паставілі перад культурнай палітыкай задачу прасоўвання культурных індустрый, стымулявання прыватных інвестыцый і далейшай дэцэнтралізацыі кіравання.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Жидков, В. С. Культурная политика России: теория и история / В. С. Жидков, К. Б. Соколов. — М. : Акад. проект, 2001. — 590 с.

2. Бэрк, Пітэр. Народная культура Еўропы ранняга новага часу / Пітэр Бэрк ; навук. рэд. А. Ліс ; пер. з англ. мовы: І. Ганецкая. — Мінск : Тэхналогія, 1999. — 380 с.

3. Тревельян, Д. М. Социальная история Англии : Обзор шести столетий от Чосера до королевы Виктории / Д. М. Тревельян ; пер. с англ. А. А. Крушинской и К. Н. Татариновой ; под ред. и с предисл. В. Ф. Семенова. — М. : Изд-во иностр. лит., 1959. — 607 с.

4. Habermas, J. Vorstudien und Ergunzungen zur Theorie des kommunikativen Handelns / J. Habermas. — Frankfurt a. M., 1984. — 607 s.

5. Раев, М. Регулярное полицейское государство и понятие модернизма в Европе XVII—XVIII веков: попытка сравнительного подхода к проблеме / М. Раев // Американская русистика. Императорский период. — Самара : Самар. ун-т, 2000. — С. 48—63.

6. Wagner, Bern. Kulturpolitik. Begrundungen und Legitimation / Bern Wagner // Kulturpolitische Mitteilungen. — 2006. — IV (№ 115). — S. 72—73.

7. Петрова, Т. Г. Трансформация культуры Западной Европы в свете социально-политических и идеологических стратегий нового времени : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / Т. Г. Петрова. — М. : [б. и.], 2004. — 20 с.

8. Хестанов, Руслан. FAQ: Изобретение культурной политики. 7 фактов о первом министерстве культуры, политике СССР и мультикультурализме [Электронный ресурс] / Руслан Хестанов // Постнаука. — Режим доступа: http://postnauka.ru/faq/31218. — Дата доступа: 24.02.2016.

9. Хантингтон, С. Кто мы? : Вызовы американской национальной идентичности : пер. с англ. / С. Хантингтон ; вступ. ст. И. Феоктистова. — М. : АСТ : Транзиткнига, 2004. — 635.

10. Staatslexikon in 5 Bande. Band III: Kapitulationen bis Panslavismus. — Freiburg i. Br. : Herder, 1929. — 1935 s.

11. Измайлов, Р. И. Кемализм и модернизационные процессы в Турции в 20—30-е годы XX века [Электронный ресурс] / Р. И. Измайлов // Медина. — Режим доступа: http://www.idmedina.ru/books/materials/turkology/1/turk_izmailov.htm. — Дата доступа: 24.02.2016.

12. Cultural policy: a preliminary study. — Paris : UNESCO, 1969. — 36 p.

13. UNESCO. Intergovernmental Conference on Institutional, Administrative and Financial Aspects of Cultural Politics. Draft Final Report / UNESCO. — Venice, 1970. — 76 p.

14. Филимонов, Г. Ю. Истоки формирования культурной политики США / Г. Ю. Филимонов // Вестник РУДН. Сер. : Политология. — 2011. — № 2. — С. 79—91.

15. Smits, Yolanta. China coutry report / Preperatory action "Culture in EU external relations" [Electronic resource] / Yolanta Smits // European Commission. — Mode of access: http://ec.europa.eu/culture/policy/international-cooperation/documents/country-reports/china_en.pdf. — Date of access: 24.02.2016.

Поступила в редакцию 01.06.2016.